3. Выготский, Л.С. Воображение и творчество в детском возрасте: Психол. очерк / Л.С. Выготский. – 2-е изд. – М. : Просвещение, 1967. – 93 с.

4. Выготский, Л.С. Воображение и творчество в детском возрасте: Психол. очерк / Л.С. Выготский. – 3-е изд. – М. : Просвещение, 1991. – 93 с.

5. Выготский, Л.С. Психология развития ребёнка / Л.С. Выготский. – М. : Изд-во Смысл, Изд-во Эксмо, 2004. – 562 с.

6. Суртаев, В.Я. Игра как социокультурный феномен / В.Я. Суртаев. – 2-е изд., испр. и доп. – СПб. 2015. – 272 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Шупеніч П.У.,** студ. 114 гр.

Навуковы кіраўнік – Гулак АА.

## ВЫТВОРЧЫ АБРАД АПРАЦОЎКІ ІЛЬНУ НА ПІНСКІМ ПАЛЕССІ

Найперш адзначым, што Заходняе Палессе – гісторыка-этнаграфічны рэгіён Беларусі, які займае большую частку Брэсцкай вобласці. На поўначы па вярхоўях рэк Нараў і Ясельда гэты рэгіён мяжуе з Панямоннем, а на паўночным усходзе і ўсходзе па лініі на поўнач ад Целяхан і Лунінца і далей па міжрэччы Гарыні і Сцвігі – з Усходнім Палессем. На тэрыторыі Заходняга Палесся вылучаюцца мясцовыя этнаграфічныя групы *пінчукоў* і *падлясян (падляшан)* з уласцівымі ім самабытнымі рысамі традыцыйнай культуры і побыту. Абмежаванасць ворных зямель, багатая азёрная і рачная фауна абумовілі спецыфіку гаспадарчых заняткаў жыхароў Пінскага Палесся, побач з земляробствам, жывёлагадоўляй важнае значэнне мелі рыбалоўства і збіральніцтва [2

с. 328]. Аднак у цэнтры ўвагі нашага даследавання з’яўляецца вырошчванне і апрацоўка валакністай культуры – лёну. На тэрыторыі сучаснай Беларусі лён вырошчвалі са старажытных часоў. З валакна ткалі палатно і шылі вопратку, стваралі выдатныя прадметы побыту, майстравалі цацкі для дзяцей. Насенне маглі дабаўляць у хлеб ці варылі з яго смачны кісель. В.С. Цітоў у сваёй кнізе «Народная спадчына: Матэрыяльная культура ў лакальна-тыпалагічнай разнастайнасці» пісаў: «Амаль кожны палешук вырошчваў лен каля сваей хаты, апрацоўваў яго і рабіў тканіну, тым самы апранаў усю сваю сям’ю, ну а калі у сям’і была незамужняя дзяўчана з гэтага льну дзеля яе рабілі прыданае (сарочкі, сукенкі, фартухі і г.д.)» [1 с. 248].

Вытворчы абрад апрацоўкі лёну быў зафіксаваны вясной 2015 г., навучэнцамі Пінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў пад кіраўніцтвам выкладчыка Якубчык Елены Сяргееўны. Пра абрад апрацоўкі льну паведамілі бабулі, якія пражываюць у вёсцы Дабраслаўка Пінскага раёна. Ён быў зафіксаваны на відэа для яго захоўвання і адраджэння. Па словах інфарматараў, абрад існаваў яшчэ ў 1920–1940 гг., а пасля вайны ён знік, таму што пасля вайны пачалі вырошчваць больш зернавых культур, такім чынам змянілася струкутра земляробства ў гэтым рэгіёне. Сама практычная аснова гэтага абрада паступова знікала, у выніку і сам абрад пасля некаторага часу знік. Экспедыцыі з Пінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў пашанцавала пабачыць дзеянні, якія выконваліся ў абрадзе. Потым пры дапамозе выкладчыкаў абрад адрадзілі і паказалі яго на абласным конкурсе-аглядзе творчых аб'яднанняў устаноў прафесійна тэхнічнай і сярэдне-спецыяльнай адукацыі «Сёння у нашай хаце свята» ў рамках рэспубліканскага конкурсу «Беларускі вянок» і атрымалі дыплом першай ступені. Дзеянне ў вытворчым абрадзе апрацоўкі лёну выконвалі толькі жанчыны, якія пры гэтым таксама перадавалі свой працоўны навык

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

маладым дзяўчатам. Восенню, калі ўсе работы ужо былі скончаны яны і пачыналі апрацоўваць лён. Збіраўся гурт жанчын і дзяўчат, каля пятнадцаці чалавек, у самай вялікай хаце на сяле і пачыналі апрацоўваць лён. Увесь працэс праходзіў энэргічна і весела, спявалі песні, прытанцоўвалі і смяяліся.

Адзначым, што вытворчы абрад апрацоўкі лёну пачынаецца з абрадавай песні, у якой адлюстроўваецца працэсс вырошчавання льну. Тэкст песні даецца з захаваннем мовы арыгіналу: *Посеялі дывкы лён, посеялі дывкы лён, // Дывкы лён, дывкы лён, посеялі дывкы лён. // Посеявшы, пололі, посеявшы, пололі. // Пололі, пололі, посеявшы, пололі. // Білы ручкі скололі, білы ручкі скололі. // Скололі, скололі, білы ручкі скололі. // Як убывса сывы конь, як убывса сывы конь, // Сывы конь, сывы конь, // як убывса сывы конь. // Порваў, помняў дывкам лён, порваў, помняў дывкам лён // Дывкам лён, дывкам лён, порваў помняў дывкам лён. // Дывкы коня спoймалі, дывкы коня спoймалі, // Спoймалі, спoймалі, дывкы коня спoймалі. // Коню грыву вырвалі, коню грыву вырвалі // Вырвалі, вырвалі, коню грыву вырвалі. // Да й у рэчку бросалі, да й у рэчку бросалі // Бросалі, бросалі, да й у рэчку бросалі.*

Парваны лён пачыналі калаціць прачом[1], замацаўвалі лён нагамі і пачыналі біць каб выпала насенне. Потым ставілі ў невялікія кучкі па ўсёй хаце, каб ён высах. Пасля высыхання пры дапамозе тэрныцы яго ламалі, каб зрабіць мягчэйшым дзеля дальнейшай апрацоўкі. Таксама калі праходзіў гэты працэс, спявалі песню: *В огороды тэрныца сама трэ, сама трэ. // До козака дівчына сама йдэ, сама йдэ, // А я гэту тэрныцу поломлю, поломлю, // А я гэту дівчыну полюблю, полюблю. // Ох дэб, дэб на сыло, дэб дэб на його, // Вона любыць його, пуйдэ, пуйдэ за його.* Потым лён трапалі пры дапамозе трэпала[2], каб выбіць астатнія не нужныя валокны дзеля дальнейшай апрацоўкі, і так сама лён станавіўся яшчэ мягчэй. Пасля гэтага яго бралі і часалі на дошцы, у якую былі ўбітыя цвікі. Часалі, па словах інфарматараў, як жанчына расчэсвае свае косы. Таксама падчас гэтага працэсу выконвалася песня: *Почэсала*

[1] Прач – гэта прылада працы, якой білі па льну, выраблена з дрэва.
[2] Трэпала – гэта дошка якой білі лён, зроблена з дрэва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Жэнечка білы лён (2 разы), // Да гоныла сватов з хаты вон (2 разы), // Вон воны сваты із хаты (2 разы), // Бо я буду білы лён чысаты (2 разы), // Як я білы лён почэшу (2 разы), // Тогді я сваты запрошу (2 разы).*

Тут развіваецца тэма будучага вяселля, расчосвання дзявочай касы. Восень – гэта пара вяселлляў ў Беларусі. Такім чынам, у працоўнай песні адлюстроўваецца сямейная праблематыка. Апошнім этапам апрацоўкі лёну было выраб нітак, з якіх ужо потым стваралі тканіну, а з тканіны выраблялі адзенне для ўсёй сям'і. Сёння лён у прыватных гаспадарках – амаль забытая культура: нявыгадна, працаемка, неперспектыўна. Натуральна, губляюцца навыкі ручной апрацоўкі лёну, якія з пакалення ў пакаленне трансляваліся ў асяроддзі жанчын. У гэтым сэнсе факты, зафіксаваныя ў вёсцы Дабраслаўка Пінскага раёна, з'яўляюцца надзвычай цікавымі.


1. Цітоў, В.С. Народная спадчына: Матэрыяльная культура ў лакальна-тыпалагічнай разнастайнасці. / В.С. Цітоў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 300 с.
2. Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя. – Мінск : БелСЭ, 1989. – 575 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Юркевич А.И,** студ. 311 а гр.
Научный руководитель – Смаргович И.Л.

## ОРГАНИЗАЦИЯ КУЛЬТУРНО-ДОСУГОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ПОДРОСТКОВ В УСЛОВИЯХ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ УЧРЕЖДЕНИЙ ДОПОЛНИТЕЛЬНОГО ОБРАЗОВАНИЯ ДЕТЕЙ И МОЛОДЕЖИ

**(на примере Центра технического и художественного творчества детей и молодёжи Фрунзенского района г. Минска «Зорка»)**